ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

выдаецца з 1 мая 1935 г.

1979 г.
13
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 36 (1262)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ЮБІЛЕЮ У. І. ЛЕНІНА — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

# ДАСЯГНЕННІ АДЗНАЧАНЫ

ЗНАЧНЫМІ дасягненнямі супрацоўнікаў універсітэта на міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках быў адзначаны 1979 год. На нацыянальнай выстаўцы СССР у Вялікабрытаніі экспанаваўся пульт навучальнай сістэмы, распрацаванай супрацоўнікамі кафедры ЭММ. На выстаўцы «Дасягненні савецкай навукі і тэхнікі» ў Будапешце дэманстравалася прылада для аўтаматычнага вызначэння тэмпературы ўспышкі нафтапрадуктаў.

Шырока былі прадстаўлены распрацоўкі універсітэцкіх вучоных на ВДНГ СССР. Прылады «Успышка», «Паліграф-Паток», «МАРК» адзначаны адпаведна залатым і бронзавымі медалямі. Залатых медалёў ВДНГ СССР удастоены прафесар Г. П. Давыдзюк і дацэнт А. Д. Пяшчэнка, бронзавымі медалямі ўзнагароджаны супрацоўнікі і выкладчыкі універсітэта А. І. Сачок, М. Д. Ціва, К. В. Шульга, С. А. Шчавель, Н. Г. Юркевіч.

Значную дапамогу ў падрыхтоўцы экспанатаў для выставак аказалі супрацоўнікі СКТБ з ВВ. Намеснік загадчыка аддзела І. Н. Руды ўдастоены сярэбранага медаля ВДНГ СССР за канструктарскую распрацоўку прылады для аўтаматычнага вызначэння тэмпературы ўспышкі нафтапрадуктаў.

На пастаянную выстаўку работ Акадэміі навук СССР па раздзелу «Матэматыка і механіка — народнай гаспадарцы» прыняты манаграфіі выкладчыкаў механіка-матэматычнага факультэта А. І. Марычава «Метады вылічэння інтэгралаў ад спецыяльных функцый» і Я. В. Радына «Задачы і практыкаванні па функцыянальнаму аналізу».

На рэспубліканскай выстаўцы «Вынаходніцкая і патэнтналіцэнзійная работа ў Беларускай ССР» увагу наведвальнікаў прыцягнулі новыя фотаматэрыялы, распрацаваныя супрацоўнікамі кафедры неарганічнай хіміі.

Дыпломамі ВДНГ БССР адзначаны 10 экспанатаў, падрыхтаваных супрацоўнікамі фізічнага факультэта і факультэта радыёфізікі. За распрацоўку комплексу прылад для навуковых даследаванняў дыпломаў ВДНГ БССР І ступені ўдастоены калектывы кафедр ядзернай фізікі і фізікі паўправаднікоў.

Работа універсітэта па прапагандзе лепшых навуковых дасягненняў, актыўны ўдзел у міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках адзначаны грашовай прэміяй Мінвуза БССР.

Заканчваецца год, але напярадзе новыя выстаўкі, якія чакаюць лепшых распрацовак вучоных і спецыялістаў нашага універсітэта.

Абнаўляецца экспазіцыя ВДНГ БССР, у разгары падрыхтоўка рэспубліканскай выстаўкі навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, гатовы прыняць новыя прылады і распрацоўкі павільёны ВДНГ СССР «Машынабудаванне», «Хімія», «Вылічальная тэхніка» і іншыя.

**С. ПАВАЛЯЕЎ,**
**начальнік аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.**

# НАВІНЫ БДУ

## *«Каранацыя» першакурснікаў*

**адбылася на факультэце журналістыкі. Спачатку студэнтаў павіншаваў дэкан факультэта Рыгор Васільевіч Булацкі, а потым студэнты старэйшых курсаў. Цёплымі, сардэчнымі, поўнымі гумару былі іх віншаванні.**

**Цудоўна быць у цэнтры ўвагі. Але рабяты вельмі хваляваліся, бо ад іх чакалі адказу сябры-старшакурснікі. І калі на сцэне паявіліся першакурснікі з лялькамі, банцікамі, у кароценькіх сукенках і панчошках, зала дружна заапладзіравала. Вельмі спадабалася і дыскатэка. Кожны пачуў сваю любімую песню, ансамбль. Для кожнага першакурсніка словы: «Клянуся заўсёды знаходзіцца на пярэднім краі, быць верным салдатам партыі...» прагучалі як прынцып далейшага жыцця.**

**А. ВАРАХОБКА.**

## *Сапраўднае свята*

**моладзі, якая займаецца ў вышэйшых навучальных установах — гэта Міжнародны дзень студэнтаў. І адзначаюць яго 17 лістапада. Гэта ведае кожны.**

**І таму можа здацца дзіўным, што балгарскія студэнты сваё свята адзначаюць 8 снежня.**

**Гэты дзень цесна звязаны з рэвалюцыйнымі традыцыямі прагрэсіўнага студэнцтва Балгарыі. Ён набыў вялікі ідэйна-палітычны змест і зараз з'яўляецца сімвалам барацьбы і імкнення да будучага. На гэты раз ён адбыўся на філфаку.**

**Балгарскія студэнты, якія займаюцца ў Мінску, запрасілі савецкіх сяброў, гасцей з Чэхаславакіі, Польшчы, ГДР, Лівана, Марока і іншых краін. Вечар выліўся ў свята непарушнай дружбы.**

**П. ПАШАВА.**

## *Першая рэспубліканская*

**міжвузаўская канферэнцыя маладых вучоных-хімікаў прайшла на хімічным факультэце універсітэта. Яна была арганізавана саветам маладых вучоных НДІ ФХП і хімічнага факультэта пры падтрымцы грамадскіх арганізацый.**

**На канферэнцыі былі зроблены даклады па асноўных напрамках сучаснай хіміі: «Стварэнне фотатэхнічных і рэнтгенаўскіх маласярэбраных плёнак з паніжаным зместам серабра і распрацоўка тэхналагічных працэсаў меднага і нікелевага праяўлення гэтых плёнак» і «Распрацоўка біялагічных актыўных матэрыялаў і прэпаратаў для медыцыны на аснове цэлюлозы».**

**А. ВЕЧАР.**

**Даўнія сувязі існуюць паміж нашай краінай і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай. Вось ужо некалькі год Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў для гэтай краіны.**

**НА ЗДЫМКУ: моладзь з ГДР, якая займаецца ва універсітэце.** Фота **М. Дубовіка.**

# ІДЗЕ ЗВЕРКА

У камітэце камсамола універсітэта пачалася гадавая зверка членаў ВЛКСМ. Пасля справаздач і выбараў на многіх факультэтах змяніліся загадчыкі сектараў уліку і за работу ўзяліся навічкі. Мы пазнаёміліся з ініцыятыўнымі, настойлівымі, ніколі не сумуючымі камсамолкамі Святланай Голад, Наталляй Доўгіх, Ганнай Калейчык, Галінай Язневіч, Ларысай Шарко і Аленай Ціхановіч.

Дзяўчаты працаздольныя. Яны падабралі сабе надзейных памочнікаў і паспяхова спраўляюцца са сваімі абавязкамі. На сённяшні дзень мы маем інфармацыю аб ходзе зверкі шасці факультэтаў. З іх хочацца асабліва адзначыць філалагічны, механіка-матэматычны і факультэт прыкладной матэматыкі.

Зверка, праведзеная на філфаку, ацэнена на выдатна дзякуючы актыўнай рабоце намесніка сакратара па арганізацыйнай рабоце Людмілы Каладзінскай і Жаны Рымкевіч— сакратара факультэта.

Трохі спазняецца са зверкай хімічны факультэт, але спадзяёмся, што і ў іх усё будзе ў парадку, таму што зверку факультэта вядзе вопытны намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце Люба Бабіч.

Зверка працягваецца, выяўленыя недахопы будуць ліквідаваны да 20 снежня. Мы ўпэўнены ў яе якасным правядзенні, таму што у сектарах уліку сёння працуюць адны з самых творчых дзяўчат факультэтаў.

**Г. ФАЛЬКОЎСКАЯ,**
**супрацоўнік сектара уліку.**

**● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ**

# Агульныя інтарэсы

НЯДАЎНА на гістарычным факультэце створаны савет дружбы, у састаў якога ўвайшлі прадстаўнікі 13 краін. Кіруюць саветам Ігар Велічанскі, студэнт V курса аддзялення гісторыі і студэнтка з Грэцыі Яўгеніду Антсі, якая займаецца на аддзяленні філасофіі. 15 замежных і савецкіх студэнтаў савета дружбы і інтэрсектара гістарычнага факультэта выпускаюць газету «Орбіс».

Савет дружбы стварыў тры камісіі: ідэалагічную, вучэбна-выхаваўчую і культурна-масавую.

У абавязкі ідэалагічнай камісіі ўваходзіць правядзенне сумесных тэматычных палітінфармацый, арганізацыя работы клуба «Палітыкус», удзел замежных студэнтаў у будаўнічых атрадах, віншаванне з нацыянальнымі святамі. Напрыклад, нядаўна на гістарычным факультэце быў арганізаваны вечар, прысвечаны 61-й гадавіне кампартыі Грэцыі.

Вучэбна-выхаваўчая камісія арганізуе дапамогу замежным студэнтам у вывучэнні рускай мовы і пры падрыхтоўцы да экзаменаў.

Задача савета дружбы — наладзіць больш цесны кантакт з замежнымі студэнтамі, дапамагчы ім хутчэй уліцца ў жыццё камсамольскай арганізацыі факультэта.

Гаворыць старшыня савета дружбы І. Велічанскі:

— **Першыя мерапрыемствы паказалі, што яны зацікавілі студэнтаў. Пры такой арганізацыі інтэрнацыянальнай работы магчыма дасягнуць высокіх вынікаў у інтэрнацыянальным выхаванні савецкіх студэнтаў і дапамагчы замежным студэнтам выпрацаваць марксісцка-ленінскае разуменне сучаснасці.**

**Л. КУЧЫНСКАЯ,**
**А. РАЖНОВА,**
**студэнткі гістфака.**

# ПРАКТЫКА — СПРАВА СУР'ЁЗНАЯ

ВЯЛІКАЯ роля ў вучэбным працэсе геаграфічнага факультэта адводзіцца педагагічнай практыцы. Адна з груп студэнтаў-пяцікурснікаў нашага факультэта праходзіла педагагічную практыку ў гэтым годзе ў СШ № 116 г. Мінска. Гэта адна з лепшых школ Фрунзенскага раёна горада, дзе ёсць чаму павучыцца. Тут працуюць вопытныя настаўнікі геаграфіі, сярод якіх і наша выпускніца М. Пыліла. Яе ўжо трэці год запар выбіраюць сакратаром партыйнай арганізацыі школы.

Хочацца расказаць аб вопыце правядзення «Тыдня геаграфіі». Кожны дзень праводзіліся пэўныя мерапрыемствы. У першы дзень перад вучнямі старэйшых класаў і настаўнікамі школы выступіў з цікавай лекцыяй аб развіцці эканомікі Беларусі ў дзесятай пяцігодцы загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі СССР прафесар І. І. Трухан. Студэнты разам з вучнямі 8-х класаў к гэтаму дню выпусцілі спецыяльны нумар насценнай газеты «Беларусь у дзесятай пяцігодцы». Адначасова былі афармлены выстаўка літаратуры аб Беларусі і карта «Новабудоўлі Беларусі ў дзесятай пяцігодцы».

У другі дзень праведзена радыёперадача для вучняў 6—9-х класаў на тэму «У свеце цудоўнага», падрыхтаваная студэнтамі І. Аляксеевай і Н. Будзік. На трэці дзень у класах побач з правядзеннем в'ікторын, кантрольных работ быў арганізаваны конкурс насценных газет 8-х класаў (іх у школе 6), прысвечаных Беларусі.

Вельмі цікава прайшла сустрэча рабят 6-х класаў з прадстаўнікамі шэрагу дзяржаў Афрыкі ў наступны дзень. На гэту сустрэчу прыйшлі студэнты нашага універсітэта — пасланцы далёкай Афрыкі. Самыя розныя пытанні, зададзеныя вучнямі, а таксама аплады-сменты, якімі яны сустрэлі і праводзілі гасцей, сведчылі аб вялікім пазнавальным і выхаваўчым значэнні такіх сустрэч.

У заключэнне «Тыдня геаграфіі» праведзены тэматычны вечар вучняў 9—10-х класаў, прысвечаны 30-годдзю СЭУ.

**Н. ЖУРАЎСКАЯ,**
**дацэнт.**



**Цікава праходзяць лабараторныя заняткі па хіміі ў першакурснікаў біяфака.**
**НА ЗДЫМКУ: вынікі вопытаў падводзяць Л. Ярашэнкава і В. Ішчанка.** Фота **М. Дубовіка.**

**НАШЫ ІНТЭРВ'Ю**

# Ключ да сэрца

ПРАЙШЛІ справаздачы і выбары ў прафсаюзах. У прафактыў уліліся новыя людзі. Адказныя задачы паўсталі перад імі. Шмат пытанняў патрабуюць неадкладнага вырашэння. На гэту тэму і адбылася размова са старшынёй прафбюро біялагічнага факультэта Віктарам Шачанком, студэнтам IV курса.

**— Тры гады запар вас выбіраюць старшынёй прафсаюзнага бюро факультэта. Таму, напэўна, у вас ужо назапашаны дастатковы вопыт, каб аб'ектыўна асэнсаваць свае поспехі і хібы.**

**Як вы лічыце, што з'яўляецца асновай паспяховай работы прафсаюзнага старшыні, не ўлічваючы яго асабістых якасцей і адносін да справы?**

— У нас, як у альпіністаў: вяршыні можна дасягнуць тады, калі побач з табой, «у адной звязцы», ідуць надзейныя людзі, калі верыш, што ў выпадку няўдачы цябе заўсёды «падстрахуюць» сябры. Галоўнае, каб побач са старшынёй быў моцны прафсаюзны актыў. У гэтым — поспех работы арганізацыі.

**— Але ж актыў не ўзнікае сам па сабе...**

— Вядома, не. Актыў выхоўваецца. А гэта доўгі і, я б сказаў, цяжкі працэс. І пачынаецца ён з малога, з разавых даручэнняў. Мы часта ў сваёй рабоце яшчэ недаацэньваем значэнне разавых даручэнняў. І дарэмна. Яны ж, як лакмусавая папера, выяўляюць у чалавеку многае — адказнасць за даручаную справу, уменне вырашыць пастаўленую задачу. Гэта свайго роду падрыхтоўчая прыступка да далейшай работы ў прафсаюзах. Мы абавязкова стараемся ўлічваць жаданні, здольнасці чалавека. Вось, напрыклад, Ядвіга Сідар з другога курса. Дзяўчына вельмі старанная, клапатлівая. Пры выбары праворга ў 1-й групе мы і даручылі ёй гэтую справу. І зараз яе арганізацыя —адна з лепшых на факультэце.

**— Якія ж якасці, на ваш погляд, перш за ўсё неабходны прафсаюзнаму актывісту?**

— Быць актывістам — значыць мець справу з людзьмі, ведаць і разумець іх, умець пераканаць. Гэта адчуваем мы зараз, у студэнцкай аўдыторыі, а на сваім працоўным месцы адчуем яшчэ з большай сілай.

Яшчэ бываюць выпадкі, калі актывіст ад пажадання «траціць адносін» выступае ў ролі папрашайкі: прыйдзі, мілы, на пасяджэнне, а я цябе за гэта ў дакладзе пахвалю. Гэта, вядома, недапушчальна.

**— Прайшлі выбары. У састаў бюро ўвайшлі новыя людзі. Што, па-вашаму, патрэбна для таго, каб прафсаюзная арганізацыя выйшла на новы рубеж?**

— Неабходна строга прытрымлівацца прынцыпу пераемнасці. Гэта значыць, што кожны прафсаюзны актывіст рыхтуе сабе замену. Згодна з гэтым прынцыпам прафсаюзны актывіст паступова праходзіць усе этапы прафсаюзнай работы. І гэта дае вялікі вопыт у далейшай рабоце.

**— А што б вы параілі зараз тым праворгам, якія толькі пачынаюць свой шлях?**

— Не баяцца цяжкасцей. Не адступаць ад сваіх прынцыпаў. Раіцца з сябрамі, адстойваць сваю пазіцыю. Быць тактоўным, улічваць настрой людзей, быць уважлівым, памятаць, што ўвага — гэта ключ да сэрца.

**Інтэрв'ю правяла**
**А. СЕРЫК.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

**НА ТЭМЫ МАРАЛІ**

# Калі забілі ў званы...

ГІСТОРЫЯ даволі банальная. Іншы раз можна было б прайсці міма, не прыкмеціць. Іншых разоў было шмат, толькі чуткі не распаўсюджваліся. Тушылі тут жа, на месцы. Смехам, жартамі. Можа з-за таго, што было смешна, ніхто не выносіў смецця з хаты, баючыся, каб не абсмяялі таго, хто выносіў. Можа, хто яго ведае, толькі час ад часу ад гэтага «смеху», да якога ўжо сталі прывыкаць, станавілася не зусім смешна. А атмасфера ў інтэрнаце № 4 па Паркавай магістралі стала падобна мыльнаму пузыру, на які ўвесь час дзьмулі, дзьмулі...

**Вы глядзелі на мыльны пузыр збоку? Прыгожы! А самі сябе бачылі ў ім, сваё адлюстраванне? Не зусім прыемна быць у сапраўднасці такім. Праз рознакаляровыя плямы на вас глядзіць не зусім прыемны твар, такі, што свайму першаму ворагу не пажадаў бы ў ім прадстаць. А ў інтэрнаце жывуць студэнты з філалагічнага, юрыдычнага і фізічнага факультэтаў — здаровыя, моцныя, вясёлыя хлопцы і дзяўчаты. І шмат каму з іх патрэбна было б зазірнуць у той мыльны пузыр, пабачыць, усвядоміць, падумаць, прыняць рашэнне. Пакуль не позна, пакуль пузыр не лопнуў над іх галавой. І ён лопнуў. Раптоўна, неспадзявана. Як для студэнта III курса юрыдычнага факультэта Валерыя Ждана, так і для ўсіх яго сяброў, выкладчыкаў факультэта. Лопнуў тады, калі так званае «смецце» вынес са сваёй хаты, менавіта інтэрната № 4, камендант А. Чыкілёў. Вынес адзін, не пабаяўся, што аднаму не пад сілу ўзважыць усе факты.**

Банальнасць іншы раз выкідвае злосныя жарты, і сляпая вера ў яе прыводзіць да пабудовы самастойнай тэорыі, асэнсавання падзей толькі адносна свайго пункту погляду, абвяргаючы вядомую аксіёму. Да жыцця прымяніць аксіёму цяжка—у яго шмат выключэнняў, і, сказаўшы калі-небудзь «не трэба, гэта дрэнна, так ніхто не робіць, гэта амаральна», міжволі задумаешся над гэтым выпадкам. Чаму так здарылася? Чаму сябры не астудзілі пыл В. Ждана? Дзе яны былі тады? А гэты выпадак запомніцца Валеру на ўсё жыццё. Абыякавасць іншых да падзей, якія праходзілі ў той вечар, павярнулася вельмі вострым вуглом да іх сябра.

У той вечар, а дакладней, 27 кастрычніка, Валера вярнуўся з дня нараджэння свайго сябра. Былі ў рэстаране. Субота, перадвыхадны дзень. У рэстаране выпілі, нельга сказаць каб многа, але гэта ўжо потым ніякага сэнсу не мела. Гэтага не адвяргае сам Валера. Не адвяргае таго, што ў той вечар ён абразіў каменданта інтэрната. Так сказана ў тлумачальнай запісцы і ў дакладной каменданта. А мог бы і не сказаць, гаварыць адваротнае, схітрыць. Дарэчы, ніхто больш не чуў і не бачыў інцыдэнта (?!). Сказаў, як потым многа разоў будзе гэтае ж самае паўтараць на сходзе курса, групы, партбюро, партыйным сходзе, дэканату факультэта, сябрам. Размоў было шмат, ужо пасля ўсяго зробленага. Адны спачувалі, другія шкадавалі, трэція гаварылі, што патрэбна неяк ратаваць Валеру, чацвёртыя пісалі пратаколы, нават не задумваючыся аб самім здарэнні. А шкада...

Спачатку апамяталіся ў студсавеце. Першага лістапада адбылося пасяджэнне, на якім разглядалі справу В. Ждана. Дзіўна было адно, што далажыць аб здарэнні не было каму. Камендант не прыйшоў. Не прыйшоў і праз дзве гадзіны, на якія адклалі пасяджэнне з надзеяй, што сведка ўсё ж будзе. Дакладваць прыйшлося самому Ждану. Больш сведкаў не было, не маглі знайсці. Уражанне такое, што ўсё расказанае праходзіла ў лесе, а не на другім паверсе інтэрната...

**«Я, Ждан В. М., растлумачваю факт, які адбыўся 27 кастрычніка 1979 года. Я прыйшоў у інтэрнат № 4 з дня нараджэння. Мяне папрасілі зрабіць танцы. Я сказаў, што паколькі адмянілі вечар на факультэце, то і ў інтэрнаце рабіць нічога нельга. Яны адказалі, што ў інтэрнаце ніхто аб гэтым нічога не гаварыў і што тут жывуць не толькі адны юрысты. Потым я пайшоў прасіць ключ ад залы. Не знайшоўшы, вярнуўся ў пакой. Мне сказалі, што ключ знайшлі і можна выносіць апаратуру. Я адказаў, што няхай робяць што хочуць, і выйшаў. Апаратуру вынеслі. Потым мне паведамілі, што прыйшоў камендант, забараніў танцы, парваў правады. Я пайшоў да яго. Дзверы не адчынілі. Я выказаў у адрас каменданта некалькі непрыстойных слоў. Я не ведаю і не магу ведаць, хто і як адчыніў дзверы ў зале, хто менавіта выносіў апаратуру, бо ў той час у пакоі мяне не было. У інтэрнаце алкагольных напіткаў я не распіваў».**

**(З тлумачальнай запіскі В. Ждана).**

Рашэнне студсавета было патрабавальным і катэгарычным, як і павінна было чакаць: выселіць з інтэрната. Хаця правоў, відаць, на гэта зусім не мелі. Рашэнне было вынесена неабдумана, дзеля таго, каб потым пляснуць у далоні і з палёгкай уздыхнуць, што справа зроблена. А думаць іншы раз нядрэнна...

Амаль кожную суботу ў інтэрнаце плануюцца вечары адпачынку, але на гэтую, невядома толькі па якой прычыне, нічога не было запланавана. Зусім нічога. Гэтая субота выпадала з поля зроку студсавета, яна аддавалася на волю лёсу саміх студэнтаў. Хто як зможа. І змаглі. Ніхто не бачыў тых, хто нёс апаратуру. Нехта ўзламаў тыя дзверы, паставіў апаратуру, уключыў магнітафон. Ніхто нічога не бачыў. Старшыні студсавета В. Каліноўскага ў той час у інтэрнаце не аказалася — быў на вяселлі. Яго намеснік М. Мінзер можа і быў, але толькі не на сваім месцы, не пры сваіх абавязках, якія павінен выконваць. А апаратыўная група інтэрната, дзяжурны па інтэрнату? Яны таксама адсутнічалі? Таму, што здарылася, можна не здзіўляцца. Да гэтага, відаць, прывыклі, і каб не абраза, якая закранула асабіста самога каменданта, і гэты выпадак прайшоў бы непрыкметна.

**Канец быў даволі празаічны: камендант выключыў апаратуру, забраў з сабою правады і зачыніўся ў сваім пакоі. Справа зроблена. Тады ў яго адрас з-за зачыненых дзвярэй паляцелі словы абразы. Ён не адчыніў В. Ждану, які стукаў у дзверы, каб забраць правады, не выйшаў, каб прыпыніць яго як таварыш, нават як камендант. Назаўтра прабачэнні В. Ждана не былі прыняты. Вельмі нізка было прыняць іх... Разбіраліся доўга. Цэлы месяц. А 1 снежня быў загад аб выключэнні з ліку студэнтаў юрыдычнага факультэта В. Ждана.**

Ёсць такі выраз: факт меў месяца. Вельмі кароткі, катэгарычны і ясны. Характарыстыку Валерыю даюць усе амаль аднолькавую: «Камуніст. Ніколі не піў, трэці год камсорг групы, член студсавета, адказны

сярод такіх вядомых паэтаў, як Пятро Прыходзька, Мікола Лойка, Рыгор Барадулін, паявілася прозвішча і студэнта 4-га курса факультэта журналістыкі Алеся Усені.

Аматараў прозы зацікавіла выступленне Уладзіміра Дамашэвіча. Ён сказаў:

— Для журналіста ці пачынаючага пісьменніка патрэбна ўпэўненасць у сваіх сілах, працавітасць, любоў да справы, якую выбраў і якой аддаеш усё жыццё.

У аддзеле прозы побач з вядомымі імёнамі паяўляюцца і імёны тых, хто толькі спрабуе свае сілы.

Заключнае слова сказаў Алесь Гаўрон. Нядаўна ён скончыў факультэт журналістыкі, і таму ў яго памяці яшчэ не сцерліся ўспаміны аб студэнцкім жыцці. А яго словы:

— Пішыце больш і прыходзьце да нас, абавязкова прыходзьце. Мы вас чакаем! — былі успрыняты кожным як асабістае запрашэнне.

...Зазірнуць у свет цудоўнага заўсёды цікава і захапляюча. І кожны раз мы будзем з задавальненнем чытаць чарговы нумар часопіса «Маладосць» і ўспамінаць гэту незабыўную сустрэчу.

**Т. НАРКЕВІЧ,**
**Л. ТУРБАЛ,**
**студэнты II курса факультэта журналістыкі.**

**На здымках:** выступае **А. Гаўрон**; уважліва слухаюць студэнты вопытных журналістаў.

# КАРЫСНАЯ СУСТРЭЧА

КАЛІ НА ДОШЦЫ аб'яў паявілася паведамленне аб сустрэчы з калектывам рэдакцыі часопіса «Маладосць», усе з нецярплівасцю чакалі яе. На гэты раз гасцямі журфакаўцаў сталі Мікола Аўрамчык, загадчык аддзела паэзіі часопіса, Уладзімір Дамашэвіч, загадчык аддзела прозы, Алесь Гаўрон, супрацоўнік аддзела нарыса і публіцыстыкі і адказны сакратар часопіса Леанід Дайнека.

Першым перад студэнтамі выступіў М. Аўрамчык. Ён расказаў аб тым, як пачынаў сваё жыццё часопіс, якія змены адбыліся ў ім за час існавання.

У заключэнне Мікалай Якаўлевіч назваў імёны тых, хто ў бліжэйшых нумарах часопіса надрукуе свае вершы.

І было вельмі прыемна, што за культурна-масавы сектар у інтэрнаце. Тры разы выязджаў у будатрад. Актыўна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці факультэта...». Добрыя словы. Але ж не патрэбна забываць і пра тое, што яму ўжо аднойчы была аб'яўлена строгая вымова з занясеннем у асабістую картку.

Здзіўленні на факультэце скончыліся напружанай цішынёй, у надзеі на лепшае. Даруюць, вунь колькі выпадкаў было, і нічога...

Праз два тыдні на партыйным бюро факультэта пры разгледжанні справы В. Ждану была аб'яўлена вымова з занясеннем у асабістую картку. Толькі пасля партбюро апамяталася партыйная група курса. Тэрміновае пасяджэнне, разбор падзеі і рашэнне — падтрымаць партыйнае бюро. Спяшаліся. Могуць падумаць, што партыйная група прайшла міма выпадку. Не, вось і пратакол аформлены, і выступаючыя ёсць, і рашэнне. Нядрэннае рашэнне. Толькі ці стаіць за гэтым сапраўднае абмеркаванне жыцця ўсяго курса? Дзелавое, прынцыповае, партыйнае.

**Справа набірала сур'ёзны размах, а курс маўчаў. Маўчала і група, у якой вучыўся Валера. Праз дзень пасля партыйнага бюро на стол дэкана прынеслі паперу — прашэнне курса, каб В. Ждана не выключалі з універсітэта. І толькі праз месяц, а менавіта 29 лістапада, спахапіліся ў групе, сабраліся, пачалі абмяркоўваць, што яшчэ можна зрабіць, разбіравацца, як і што было, хто сапраўды ў гэтым вінаўны. Можа, і тыя, хто нёс апаратуру, падключаў, хто да цяперашняга часу застаўся невядомым. Яны змаўчалі. А можа і яны ўсе разам, што не змаглі ў той вечар спыніць Валеру, умяшацца, навесці парадак, нават калі ўжо і здарылася, разабрацца назаўтра, выявіць прычыны. Позна. Вельмі позна забілі ў званы...**

А назаўтра, на адкрытым партыйным сходзе зноў былі спрэчкі, абяцанні, прапановы. Толькі маўчалі тыя, хто быў тады побач. Маўчалі... У цішыні, маўчанні, раўнадушшы — той корань, які патрэбна знайсці, абудзіць, ажывіць, пакуль не забіла пустазелле. Партыйны сход падтрымаў рашэнне партбюро. Разышліся ўзбуджаныя, з прадчуваннем таго, што нешта згубілі, прайшлі міма.

На стол рэктара ляглі матэрыялы справы В. Ждана. Праз дзень прыйшлі прадстаўнікі групы і факультэта. Гэта было, відаць, апошняе, што яны жадалі зрабіць. Хадатаі на чале са студэнткай Л. Міхальковай упрошвалі зрабіць усе магчымае. Але позна апамяталіся. Дзе яны былі раней? Тады, 27 кастрычніка, калі была субота...

Толькі 7 снежня ў інтэрнаце № 4 адбыўся сход партыйнай групы, на якім абмяркоўвалася пытанне аб В. Ждане. А. Чыкілёў зноў не прыйшоў, абмяркоўвалі без яго. Тады нехта выступіў, сказаў, што хопіць гаварыць пра Ждана. Справа мінулага, патрэбна глядзець наперад. У нас яшчэ шмат такіх вечароў. На гэтым і скончылі. Шкада. Пагаварыць было аб чым. Пагаварыць па-сапраўднаму, па-партыйнаму. Напарадзе яшчэ столькі суботніх вечароў, столькі нязробленых спраў...

**Ул. БЕЛЬСКІ,**
**наш кар.**



# ПРЫЗВАННЕ КОЖНАГА

ЧАЛАВЕК — гэта свет. Складаны і незвычайны. Свет уласных пачуццяў і думак, якія вядуць яго па дарозе жыцця. І калі побач ёсць сапраўдныя сябры, то ісці па ёй значна лягчэй. А калі няма? Калі побач проста людзі, з якімі ты павінен сустракацца кожны дзень, як гэта робім мы, студэнты, у сваіх акадэмічных групах? Як тады разумець паняцце «дружны калектыў»? І ці можа група індывідумаў ператварыцца ў яго?

Знаёмцеся: шостая група чацвёртага курса фізічнага факультэта. Адна з лепшых груп на фізфаку. Займаецца яна на тэарэтычнай кафедры. Фізіка патрабуе няспыннай самастойнай працы. Кожны дзень. Увесь час. І як вынік — удасканальванне не толькі прафесійных якасцей чалавека, але і адносін у калектыве.

Гаворыць камсорг групы Андрэй Мацвееў: «Наш калектыў склаўся на трывалай базе агульных інтарэсаў. Мае сябры Валянцін Гілеўскі, Георгій Крылоў, Сяргей Саковіч і іншыя ў будучым уяўляюць сябе вучонымі. І гэта не проста словы. Гэта ўпэўненасць. Упэўненасць у сваіх сілах. У сілах усяго калектыву».

Сапраўды, у шостай групе пануе атмасфера добразычлівасці. Поспех аднаго становіцца поспехам усіх. Гэта — закон.

Добрым падмуркам гэтага з'яўляюцца і тыя тэарэтычныя семінары, якія арганізуюць самі рабяты. Мэта правядзення кожнага такога семінара — знаёмства з работай таварыша, з яго думкай наконт таго ці іншага навуковага пытання, праблемы. І ў час гэтага знаёмства, як адной з форм сур'ёзных адносін паміж аднакурснікамі, узнікаюць спрэчкі. Часам доўгія і моцныя. Але потым яны вырашаюцца. Застаецца захопленасць сваёй справай. Яна збліжае і ператвараецца ў сяброўства. Так нараджаецца калектыў. Па-сапраўднаму дружны і згуртаваны.

**С. ГУК.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**



# ГАРМОНІЯ ХВІЛІН

СПАТКАННІ мая гераіня любіць прызначаць пад гадзіннікам. Як усе закаханыя. Хоча зафіксіраваць кожную хвіліну. Каб пасля скласці з іх вобраз дня, тыдня, года, жыцця...

Радасна ўсміхнуўшыся, жвава збягае з прыступак мне насустрач:

— Добры дзень. Можа, па дарозе пагаворым? Такое надвор'е выдатнае!

А мне ўспомніліся прыступкі, па якіх падымалася яна некалькі год назад...

Дзяўчына ўзышла на сцэну... Зрабіла першы крок да залы. Мяккі позірк чорных вачэй уабраў у сябе святло лямпы, паступова пачаў аддаваць хвалюючы бляск. Дзяўчына чытала вершы. Словы пра каханне, жыццё, вечнасць гучалі ясна і проста, а сэрцы слухачоў заміралі на імгненне — магчыма, у першы раз ад гукаў паэзіі... Дзяўчына злівалася са сцэнай, ці можа сцэна знікала, як непатрэбная мяжа паміж ёю і залай. Вось яна, здалося, лёгкім жэстам павяла ўсіх за сабою, поўным унутранай сілы голасам заваражыла, прымусіла адгукнуцца на яе пачуцці. У залу уваходзіла яе вялікасць Паэзія. Ці гэта была сама дзяўчына, якая рабіла першы крок у БУДУЧАЕ?..

Дарагі чытач, наш расказ не пра будучага артыста, філолага ці гісторыка. Мы пазнаёмім вас са студэнткай 2-га курса механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Інай Петрашкевіч.

— Цікава ў нас на факультэце вучыцца, — дзеліцца ўражаннямі аб першых кроках да будучай спецыяльнасці Іна. — Цяжка, і часу вольнага амаль што няма, але жыццё затое поўнае. Ні адной хвіліны не губляю дарма.

Выбар прафесіі лёгкай справай не бывае. Аднаму раяць бацькі і настаўнікі, другому таварышы, але канчатковае «так» ці «не» гавораць выпускнікі школы самі. Іна вызначыла для сябе даўно — будучае звяжа з матэматыкай. Даўно... А, хутчэй за ўсё, на ўроках Раісы Іосіфаўны Скроцкай. Крэйда ў руках гэтай настаўніцы-чараўніцы выводзіла на дошцы не проста прамыя, эліпсы, квадраты. Крэйда расказвала іх гісторыю, падобную на чалавечы лёс. За кропкамі на «залатым сячэнні», за лініямі гіпербал і парабал вучні бачылі «Мону Лізу» Леанарда да Вінчы, Эйфелеву вежу, піраміды Старажытнай Грэцыі і масты Прагі, чулі голас Архімеда і Фалеса, Кавалеўскай і Лабачэўскага. Любімая настаўніца вучыла бачыць гармонію прыгажосці ў лініях, чуць у жыцці крокі «царыцы ўсіх навук»—матэматыкі. І прыходзіла адчуванне перамогі пасля правільна рошанай задачы, самастойна даказанай тэарэмы. Хацелася і іншым падарыць веру ў свае магчымасці, любоў да, на першы погляд, сухіх знакаў і формул. Політэхнічны? Але там часцей будзеш сустракацца з чарцяжамі, трубамі, цэглай... А ёй, Іне, патрэбны жывыя людзі, тыя, каму кожную хвіліну магла б прыносіць карысць.

У Іны — асаблівая ўлада над людзьмі, уменне зацікавіць, павесці за сабою. Гэта, відаць, і ёсць арганізатарскі талент. З людзьмі працаваць вучылася кожны дзень. Староста класа, старшыня савета атрада, сакратар камітэта камсамола школы. Аднакласнікі верылі ёй, хацелі, каб яна вяла іх за сабою. Ужо другі год ідзе, як скончыла Іна школу, а яе прысутнасць адчуваецца тут. На школьны вечар беларускай паэзіі вядучай запрасілі Іну — ужо студэнтку БДУ імя У. І. Леніна. Часта ўспамінае яе і завуч па пазакласнай рабоце Н. У. Капцэвіч:

— Не было ў мяне лепшага за Іну Петрашкевіч сакратара камітэта камсамола, прынцыповага і такога чалавечнага.

Цяпер Іна — староста групы, член камсамольскага бюро патока.

— Цікавыя вечары ў нас бываюць, — расказвае яна пра жыццё сваёй групы. — У нас вучыцца больш дзяўчат. Каб весялей праходзілі «агеньчыкі», вечары, запрашаем да сябе студэнтаў з інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі. Сапраўднымі сябрамі сталі.

Сёння Іна спяшалася ў Палац воднага спорту арганізаваць здачу групай нарматываў ГПА па плаванню. Асенняе лісце шамацела пад упэўненымі яе крокамі. Колькі нявырашаных праблем, мар. Як спланаваць свой час, каб усё паспець? Як усё сумясціць? Цяжкія крокі да БУДУЧАГА...

Памятаюць у школе і выдатныя адказы Іны на ўроках. Да сваіх ведаў яна прывыкла ставіцца вельмі сур'ёзна. Шмат чытала, рашала дадаткова — у выніку прызавыя месцы на школьных і раённых алімпіядах.

Чалавеку, які скончыў школу з залатым медалём, добра вядома цана пяцёркі. Але Іну хвалюе не адзнака, а тое, колькі ведаў змяшчае яна ў сабе.

— Летнюю сесію таксама здала на выдатна? — пытаюся ў Іны.

— На выдатна. Білеты да экзамена вывучыла. Але было некалькі пытанняў «слізкіх», адказы на якія не ўкладваліся ў строгую лагічную сістэму. Выцягнула якраз два з такіх. Паўтары гадзіны адказвала. Выйшла, а мне дзяўчына: «Чаго ты такая невясёлая? Мне б тваю пяцёрку, толькі б мяне тут і бачылі»... А ў мяне так непрыемна на душы, —успамінае Іна.

Не прывыкла яна адкладваць на заўтра тое, што можа вывучыць сёння. А калі вучыць, дык вучыць, каб засталося ўсё не толькі на час сесіі, а і на БУДУЧАЕ...

Іна правяла позіркам вясёлую студэнцкую кампанію:

— Ад душы шкадую тых, хто не быў у будатрадзе. Самая трывалая студэнцкая дружба пачынаецца там.

Сёлета Іна была байцом СБА. Колькі ўражанняў, новых сяброў, а галоўнае, выпрабаванне для самой сябе.

— З будатрада прыехала, — прызнаецца яна, — тыдзень не ведала, што і рабіць. Добра, што школьныя сябры вярнуліся з СБА—дзяліліся вопытам працоўнага семестра. У наступным годзе зноў «на памідоры», у Малдавію. На будоўлю калі паедзе дзяўчына, больш за хлопца наўрад ці зробіць. А ў полі патрэбны нашы дзявочыя ўмелыя рукі.

— Самая вялікая з нас аптымістка ў СБА была Іна, — з цёплай усмешкай гаворыць яе сяброўка.—І працавала выдатна. І вершы складала да нашых юмарыстычных вечароў. А яшчэ былі «ночы паэзіі». Пасля цяжкага працоўнага дня, калі ляжалі ўжо ў пасцелі, Іна пачынала чытаць вершы. І мы ўспаміналі радкі сваіх любімых паэтаў. Спаць зусім не хацелася...

Яе будучая прафесія — работа з дзецьмі. Нездарма Іна выбрала педагагічны паток — у жыцці хоча прынесці максімум карысці. А выхаваць за сваё жыццё некалькі дзесяткаў сапраўдных гаспадароў БУДУЧАГА — ці ж гэта не шчасце? Напарадзе першая практыка, першы ўрок, першая адзнака...

— Хвалююся за тое, каб калектыў настаўнікаў падабраўся добры, творчы. Каб былі ўзаемаразуменне, павага, — гаворыць Іна і ўсміхаецца промням сонца, якія перасякаюцца ў глыбіні яе вачэй, — а дзяцей я люблю. Шчыра. Яны, буду спадзявацца, мяне зразумеюць...

Для таго, каб крокі сённяшнія былі крокамі ў БУДУЧАЕ, патрэбна смеласць і жыццёвая прамата. І яшчэ ўменне марыць. А БУДУЧАЕ—гэта гармонія Матэматыкі і Паэзіі, Фізікі і Лірыкі. Яна нараджаецца ўжо сёння.

**Г. САЧАНКА,**
**студэнтка журфака.**

УНІВЕРСІТЭТ — АЛІМПІЯДЗЕ-80

# Мінск, вуліца Кастрычніцкая...

...НА СТАЛЕ папкі, графікі, планы, справаздачы, распрацоўкі. Амаль на кожным з іх паметка — «Алімпіяда-80». Гэта ўжо стала звыклым і ў той жа час з'яўляецца стымулятарам для найбольшай актывізацыі працы, накіраванай на падрыхтоўку універсітэта да XXII Алімпійскіх гульняў.

— Да лета яшчэ шмат часу, але для нас, — дырэктар студгарадка ківае на паперы, — яно зусім блізка, у нас іншыя меркі. Шмат зроблена, але нямала засталося і зрабіць.

Сапраўды. На першы план паўстала пытанне падрыхтоўкі трох інтэрнатаў універсітэта да прыёму замежных і савецкіх турыстаў. Дастаткова сказаць, што на капітальны рамонт інтэрнатаў № 2, 6, 7 адпушчана 216,8 тысячы рублёў. Акрамя таго, зусім нядаўна інстытут «Белдзяржпраект» зрабіў дадатковы каштарыс яшчэ на 116 тысяч рублёў. Лічбы гавораць самі за сябе. Дарэчы, можна дабавіць, што ні адзін з трох названых інтэрнатаў не ўвахо-дзіць у графік капітальнага рамонту на бліжэйшыя гады. Яны лічацца новымі. Рамонт інтэрнатаў выклікаў шмат меркаванняў. Чаму іменна мы? Можна назваць другую лічбу — 1600 студэнтаў, якія жылі ў інтэрнаце № 7. Літаральна — гэтыя месцы ліквідаваны. Дырэкцыя студгарадка прыняла ўсе меры, каб вырашыць пытанне з засяленнем студэнтаў. Рашэннем гарвыканкома горада Мінска і санэпідэмстанцыяй было дазволена засяленне ў кожны пакой па пятаму чалавеку. Толькі ў інтэрнаце № 2 такім чынам было выдзелена каля трохсот месц. Відаць, кожная справа патрабуе нейкай ахвяры. Гэта— не ахвяра, гэта рацыянальны падыход для больш аптымальнага вырашэння пытання, гэта — наша лепта ў агульную справу, якую робіць універсітэт, уся краіна ў цэлым.

Рашэнне аб стварэнні гасцініц для нашых і замежных студэнтаў на базе трох інтэрнатаў універсітэта было вынесена аргкамітэтам «Алімпіяды-80», які створаны ў Мінску, і адобрана аргкамітэтам г. Масквы. Зараз у інтэрнатах поўным ходам ідзе рамонт. Асвоены тысячы рублёў, растуць няўмольна ўверх графікі планаў выконваемых работ, завозіцца мэбля, мяккі інвентар, па што патраціцца 242 тысячы рублёў. У інтэрнатах будуць працаваць жаночыя і мужчынскія цырульні, медпункты, майстэрні па рамонту абутку... Вынікі работы відаць. Хаця, выходзячы з магчымасцей генпадрадчыка «Мінрамбудтрэста» № 2, які і праводзіць капітальны рамонт, можна было б зрабіць і больш. Тэрмін здачы інтэрнатаў — снежань. Па графіку. Фактычна і больш рэальна можна перарэзаць чырвоную стужку толькі ў сакавіку, красавіку. А пакуль у інтэрнатах шумяць машыны, якія чысцяць паркетныя падлогі, казыча нос востры пах фарбаў, лакаў.

Пасля летніх канікулаў у свежаадрамантаваныя пакоі заселімся мы — студэнты. Адцвіце алімпійскае лета, і, відаць, потым яшчэ доўга будуць памятаць яго замежныя турысты у сваёй краіне. Будуць успамінаць Беларусь, Мінск, вуліцу Кастрычніцкую...

**Ул. БЯЛОЎ.**

Гэты здымак зроблены ў час правядзення чэмпіяната універсітэта па шашках. Павел ЦУНІК (злева) і Уладзімір КАПСКІ (у цэнтры), якія выступаюць за каманду факультэта журналістыкі — бронзавага прызёра мінулагодняга чэмпіяната, — уважліва аналізуюць пазіцыю.

Фота Ю. БОНДАРАВА.

ДЗЮ-ДО

# Не паўтарыць памылак

«Іпон» — значыць перамога. Гэту каманду, відаць, запомнілі ўсе, хто прысутнічаў на нядаўна прайшоўшым першынстве універсітэта па барацьбе дзюдо. Вельмі ж часта яна гучала ў адзнаках суддзяў. Агаворымся: ніякіх заўваг у іх адрас няма. Судзейства, як кажуць, было «класным». Здзіўляе іншае.

На першынство было заяўлена 79 удзельнікаў. 57 з іх прайгралі паядынкі менш чым за мінуту, прычым адным і тым жа прыёмам «ассаекоме» — утрыманнем.

Майстэрства ўдзельнікаў не выдзялялася высокім узроўнем. За выключэннем пяці-шасці чалавек ніхто больш не быў знаёмы з правіламі гэтай цікавай японскай барацьбы. Некаторыя каманды «шыдо» (заўвага), «чуй» (папяроджанне) успрымаліся як штосьці страшнае і балючае. Адзнакі «кока», «юка» амаль зусім не даваліся, бо для іх патрэбны майстэрскія прыёмы, якіх, на жаль, так і не ўдалося ўбачыць.

У агульнакамандным заліку першае месца занялі дзюдаісты фізічнага факультэта. Другімі былі спартсмены гістарычнага факультэта, трэцімі — мехматаўцы.

Чэмпіёнамі універсітэта па весавых катэгорыях сталі: У. Якуш (хімфак), Я. Ляльчук (ФПМ), Л. Гросэ (фізфак).

Але зусім мала добрых слоў можна сказаць і ў іх адрас. Акрамя майстра спорту Я. Лельчука ды абсалютнага чэмпіёна універсітэта У. Кляцкова ніхто з пераможцаў не паказаў цікавай, разнастайнай барацьбы, хоць гэтым відам спорту займаюцца многія.

Хацелася б звярнуць увагу на тое, каб адказныя за барацьбу пры спортбюро факультэтаў з поўнай адказнасцю аднесліся да падбору сваіх зборных. Так, напрыклад, каманда юрыдычнага факультэта, якая на працягу двух апошніх год займала першае месца, сёлета выступіла значна ніжэй сваіх магчымасцей. Нават не стала прызёрам. І яшчэ. Не трэба забываць, што гонар факультэта павінны абараняць не першыя папаўшыя «пад руку», а дастойныя. Хутка чэмпіянат універсітэта па барацьбе самба. І памылкі, якія мелі месца ў гэтым першынстве, не павінны паўтарыцца.

**А. РУСАКОВІЧ,**
**удзельнік спаборніцтваў.**

На здымку: чарговы паядынак першынства.

ФУТБОЛ

# ДЗЕЛЯ БУДУЧЫХ ПЕРАМОГ

ІШЛА звычайная трэніроўка зборнай каманды універсітэта па футболу. Спартсмены рабілі размінку. Рывок, каскад скачкоў і зноў рывок...

У перапынку я падышоў да трэнера каманды В. Д. Ліштвана і задаў яму некалькі пытанняў:

**— Віталій Данілавіч, пракаменціруйце, калі ласка, выступленне каманды ў мінулым сезоне.**

— Адзначу, што мінулы сезон быў для нас вельмі паспяховым. На турніры па міні-футболу на прыз лётчыка-касманаўта П. Клімука каманда універсітэта была лепшай. Яна перамагла ўсіх сваіх саперникаў. Паказала добрую камбінацыйную гульню.

**— У чым, на ваш погляд, крыецца сакрэт поспеху каманды на гэтым турніры?**

— У лістападзе мінулага года мы пачалі падрыхтоўчы перыяд. Чаргуючы трэніроўкі ў зале цяжкай атлетыкі з кросамі і, безумоўна, з мячом, мы вырашалі важную задачу: падвесці пік спартыўнай формы да пачатку гэтых спаборніцтваў. Акрамя таго, усе рабяты сумленна аднесліся да трэніровак. Наогул наша каманда — гэта перш за ўсё дружны і згуртаваны калектыў.

Не аднойчы даводзілася камандзе ў час турніру паказваць свой характар. У першай жа гульні яе саперникамі былі футбалісты інстытута фізічнай культуры, якія ўжо ў першым тайме мелі ў сваім актыве чатыры галы. У гэтых складаных псіхалагічных умовах каманда зраўняла лік, і толькі спартыўнае шчасце ўратавала ІФК ад паражэння. Пасля гэтай гульні рабяты паверылі ў свае сілы і зразумелі, што павінны змагацца за першае месца. І, напэўна, не было ў спартыўнай зале балельшчыкаў, якім бы не спадабалася гульня студэнтаў універсітэта. Прыгожыя камбінацыйныя атакі, удалыя і, самае галоўнае, хуткія праходы форвардаў, добрыя абарончыя заслоны і надзейная гульня варатара каманды Юрыя Петухова, які быў названы лепшым на турніры. Праводзячы астатнія гульні з вялікім уздымам, нашы футбалісты перамаглі ў іх, забіўшы пры гэтым найбольшую колькасць галоў. Асабліва вызначыўся нападаючы каманды Валерый Зіноўчык, які дваццаць дзевяць разоў адпраўляў мяч у вароты саперникаў.

**— Валерый, што дапамагло вам дабіцца такой высокай рэзультатыўнасці?**

— Мой поспех — гэта, безумоўна, поспех маіх сяброў па зборнай. Калі побач са мной на пляцоўцы У. Гамеза, В. Бліznюк, А. Васючкоў, С. Гняўко, я адчуваю сябе вельмі добра. Бо яны разумеюць мяне, а я — іх. Мы ўжо не першы год гуляем разам, таму са сваёй асноўнай задачай форварда я справіўся паспяхова.

На высокім узроўні правялі футбалісты БДУ і сустрэчы на першынстве абласнога таварыства «Буравеснік». Толькі моцная каманда інстытута фізічнай культуры ў фінальным матчы з мінімальным лікам 1:0 перамагла студэнцкую зборную універсітэта. Цікава, што ў гэтых спаборніцтвах удзельнічалі тры каманды, якія выступаюць ў першынстве рэспублікі. Прычым іх састаў быў узмоцнены футбалістамі з розных каманд другой лігі чэмпіяната СССР. Трэба адзначыць зборную універсітэта: другое месца пасля чацвёртага мінулагодняга з'яўляецца выдатным вынікам.

Побач з ветэранамі каманды выдатна выступалі ў гэтых спаборніцтвах «навічкі» — І. Бліznюк і М. Раманоўскі. Зазіраючы ў заўтрашні дзень, В. Д. Ліштван не пабаяўся ставіць моладзь у асноўны састаў у гульнях першынства сталіцы сярод ВНУ. І гэтая рызыка сябе апраўдала. Зразумела, што не ўсё атрымлівалася ў навічкоў, але вельмі радуюць іх сур'ёзныя адносіны да гульняў. У гэтым — аснова будучых поспехаў.

...Клопатаў у каманды шмат. І асабліва клопатаў творчага, пошукавага плана. Трэба ўдасканаліць майстэрства кожнага футбаліста, падабраць і яшчэ раз праверыць асноўны састаў. Але, на жаль, да гэтых, часта ўнутраных клопатаў, дабаўляюцца і іншыя, якія часам не залежаць ад самой секцыі.

Так, напрыклад, трэніроўкі, якія пачынаюцца вечарамі, амаль а палове дзесятай гадзіны, не могуць задаволіць нікога. Просьба трэнераў і футбалістаў перанесці трэніроўкі ў спартыўнай зале на дзень да гэтага часу засталіся без вынікаў.

**А. ДАБРЫЯН,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

Заказ № 2023. АТ 10969

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ